ТУТ І ЦЯПЕР
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
26.08.10-1.09.10 г.

## ПАДАТАК З КАНЬЯКУ



КАМУ ПЕРАПАДАЕ "КРУПНЯК"

СТАР. 5

## НЕЗАЙЗДРОСНЫ ЛЁС



БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

СТАР. 6

# ДАДЗЕНЫ ЗАГАД: ЯМУ — НА ГАМБІЮ…

## Але нам, пэўна, усё ж у іншы бок

У беларускага кіраўніцтва, якое ў гэтым годзе асабліва актыўна шукае альтэрнатыву расійскім энерганосьбітам, з'явіўся новы кантынент у гэтым плане — Афрыка.




*Маленькая Гамбія больш "гаворыць", чым "важыць"*

### ГЭТЫ ЗБАН ПУСТЫ

Інфармацыйную прастору краіны літаральна "парвала" паведамленне аб тым, што Беларусь зацікаўлена ў здабычы карысных выкапняў у Гамбіі. Ва ўсякім выпадку, пра гэта заявіў міністр замежных спраў краіны Сяргей Мартынаў пасля падпісання мемарандуму аб узаемаразуменні паміж МЗС Беларусі і Міністэрствам замежных спраў, міжнароднага супрацоўніцтва і гамбійцаў за мяжой Гамбіі, якое ўзначальвае Мамаду Тангара.

Дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БелТА прыводзіць словы С.Мартынава: "Паколькі ўласных карысных выкапняў у Беларусі няшмат, нас цікавіць усё, што неабходна для прамысловасці. Асаблівую цікавасць выклікаюць апошнія вышукі ў Гамбіі па здабычы нафты". Больш за тое, Беларусь гатова "разгледжваць праекты па арганізацыі зборачных вытворчасцей, абмене новымі тэхналогіямі, па падрыхтоўцы спецыялістаў".

Пошук альтэрнатывы расійскім энерганосьбітам — справа адназначна добрая і надзённая. Але, паводле існуючых крыніц у сусветным сеціве, у Гамбіі, тэрыторыя якой складае не больш не менш як 11,3 тысячы кв.км, афіцыйна пацверджаных запасаў нафты… не існуе. Асноўнае на дадзены момант, чым можа пахваліцца гэтая краіна, — кварцавы пясок. Магчыма, за апошні час нешта скранулася з месца ў плане разведкі пэўных запасаў нафты ў даволі слабаразвітай афрыканскай краіне, але шырокай грамадскасці аб гэтым яшчэ нічога не вядома.

Так што, як гаварыў вядомы персанаж казкі "Залаты ключык", гэты збан пусты…

*Заканчэнне на стар. 3*

### ДА ВЕДАМА

Гамбія — дзяржава ў Заходняй Афрыцы. З'яўляецца самай маленькай краінай у кантынентальнай частцы Афрыкі.

Эканамічна слабаразвітая аграрная дзяржава, у якой 30% ВУП забяспечвае сельская гаспадарка, дзе занята каля 75% працаздольнага насельніцтва. Галоўнай сельскагаспадарчай культурай з'яўляецца арахіс, які служыць асноўнай крыніцай атрымання валюты (40% кошту экспарту). Прамысловасць слаба развіта і прадстаўлена прадпрыемствамі малога і сярэдняга бізнесу. Валавы нацыянальны прадукт складае 442 мільёны долараў, 800 долараў на душу насельніцтва.

У цэлым краіна бедная на карысныя выкапні. Вялікія запасы кварцавага пяску, дастатковыя для шкляной вытворчасці, знойдзены ў Абука, Бруфуце, Дарсіламі і інш. Урад шукае інвестараў для распрацоўкі гэтых радовішчаў. На ўзбярэжжы акіяна так званы "чорны" пясок змяшчае ільменіт, руціл і цырконій.

**ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВІКІПЕДЫІ**

### ПАДЗЕЯ



## З 1 ВЕРАСНЯ АЛКАГОЛЬ ПАДАРАЖЭЕ

1 верасня стаўкі акцызаў на алкагольную прадукцыю ў Беларусі павышаюцца ў сярэднім на 10%.

Такое рашэнне прынята ў адпаведнасці з указам прэзідэнта № 439 ад 24 жніўня 2010 года, апублікаваным на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Стаўкі акцызаў на алкагольную прадукцыю мацункам 28% і больш павялічаны з 18 тыс. 830 да 20 тыс. 710 рублёў; ад 7 да 28% — з 14 тыс. 240 да 15 тыс. 660 рублёў; на каньякі, брэндзі, кальвадос, каньячныя напоі — з 15 тыс. 870 да 17 тыс. 460; на мацаваныя ардынарныя і вінаградныя (за выключэннем натуральных) віны — з 5 тыс. 100 да 5 тыс. 610; на віны вінаградныя арыгінальныя — з 22 тыс. 300 да 24 тыс. 530 рублёў.

Новыя стаўкі будуць дзейнічаць па 31 снежня 2010 года.

Папярэднія стаўкі акцызаў на алкагольную прадукцыю былі ўстаноўлены 1 студзеня 2010 года ў адпаведнасці з дадаткам да Асаблівай часткі Падатковага кодэкса. Тады яны ў сярэднім выраслі на 9%.

**БЕЛАПАН**

# ХТО ВЫЙГРАЕ Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ВАЙНЕ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І РАСІЯЙ?

**БАРЫС НЯМЦОЎ, ПАЛІТЫК (РАСІЯ):**

### “КОЖНЫ ПЕРАМАГАЕ НА СВАЁЙ ТЭРЫТОРЫІ”.

— У Мінску выйграе Лукашэнка, а ў Маскве — Пуцін. Кожны кантралюе інфармацыйную прастору на сваёй тэрыторыі і перамагае на сваёй тэрыторыі. У афіцыйнага Крамля няма мэты, ёсць успышка бяссілля і гневу. Нашы імпатэнты лічаць, што Лукашэнка ім усім абавязаны, а той так не лічыць. Вось яны ад бяссілля і вар'яцеюць. Вось і ўся гісторыя.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

### “МЫ НІКОЛІ НЕ ПРАЙГРАЕМ”.

— У канчатковым варыянце выйграе Беларусь. Гэта мая інтуіцыя. Я не ведаю, як патлумачыць такую сваю ўпэўненасць. Мы ніколі не прайграем. Я ўжо прызвычаіўся да нашых перамог. Але не спяшайцеся рабіць канчатковыя высновы праз месяц-другі. Выйгрыш у інфармацыйнай вайне будзе вызначацца толькі адным — перамогай Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах. Калі ён прайграе, з мяне піва. Інфармацыйная вайна, якую пачала Расія, звязана з некалькімі момантамі. Тактыка Расіі прымітыўная, бесталковая. Яна не ведае, што рабіць у гэтай сітуацыі. Разам з тым Расія хацела б замяніць Лукашэнку, аднак не ведае як, і не ведае кім. Але ж гэтая інфармацыйная вайна вядзецца так, быццам Расія ведае, як замяніць і кім. Сама вайна перайшла тую мяжу, калі трэба проста “нагнуць”. Але паколькі Расія не ведае “кім” і “як”, то выбары Лукашэнка выйграе і праз гэта выйграе і інфармацыйную вайну.




*Па падручніках у інфармацыйным супрацьстаянні шмат не наваюеш*

**ВІКТАР МАРЦІНОВІЧ, ЖУРНАЛІСТ:**

### “ГЛЕДЗЯЧЫ ШТО РАЗУМЕЦЬ ПАД СЛОВАМ “ПЕРАМОГА”.

— На мой погляд, тут вельмі многае залежыць ад таго, як мы разумеем перамогу. Калі мы разумеем яе як стварэнне пэўнай грамадскай думкі, дык відавочна, што ўжо перамагла Расія, таму што Беларусь не мае і ніколі не будзе мець такіх уплывовых медыя, якія сёння мае Расія. Наш спадарожнікавы канал нікому не патрэбен у Маскве. Калі ж успрымаць перамогу як нейкі палітычны вынік, дык у мяне ёсць такое адчуванне, што ніякага выніку гэтая маскоўская кампанія мець не будзе, і на выбарах зноў аб'яўяць аб перамозе Аляксандра Лукашэнкі. І можна будзе казаць аб тым, што гэтая палітычная і інфармацыйная кампанія не мела ніякага плёну. Таму што працаваць трэба заўсёды на вынік, а тут ніякага выніку не прадбачыцца. Мне здаецца, што мэта палягала ў тым, каб як мага больш аслабіць беларускі рэжым напярэдадні выбараў і каб раптоўна цудам узнік прарасійскі кандыдат, якога можна будзе сустрэць з Мядзведзевым напярэдадні галасавання і такім чынам зрабіць кандыдатам нумар адзін і кандыдатам, які пераможа на выбарах. Але ж беларускае палітычнае поле настолькі вытаптанае, што спадзявацца на гэта не даводзіцца. І відавочная перамога ва ўмовах, калі Расія не стварае свайго кандыдата, будзе належаць Лукашэнку, бо ўсе альтэрнатыўныя варыянты кшталту Някляева пакуль што нікому невядомыя.

**ДА ВЕДАМА**

Расія і Беларусь ужо амаль паўтара месяца вядуць вайну нерваў, і да снежня яна не скончыцца. Першая атака была праведзена з Масквы: 4 ліпеня тэлеканал НТБ паказаў дакументальны фільм “Хросны бацька”. На наступны дзень Мядзведзеў і Лукашэнка прыляцелі ў Астану на саміт ЕўрАзЭс і за адным махам павіншаваць Назарбаева з днём нараджэння. І тут адбыўся канчатковы разрыў. У асабістай размове з Назарбаевым, як успамінае блізкая да МЗС крыніца, моцна пакрыўджаны Лукашэнка сказаў нешта абразлівае ў адрас расійскага прэзідэнта. Назарбаеў адразу ж усё перадаў Мядзведзеву, а сам з таго часу з Лукашэнкам не размаўляе. У Маскве таксама вырашылі: гэта апошняя кропля.

Пачалася вайна на знішчэнне. Крыніца ў Крамлі расказвае, што на адной з нарад Мядзведзеў сфармуляваў новы падыход да Лукашэнкі прыкладна так: “З ім цяпер будзем, як з Юшчанкам”. Год назад Мядзведзеў публічна аб'явіў Віктару Юшчанку байкот, таму што той праводзіў антырасійскую палітыку. Да прэзідэнцкіх выбараў на Украіне заставалася ўсяго паўгода, і Юшчанка не меў ніякіх шансаў перавыбрацца.

**“РУССКИЙ NEWSWEEK”**

**ПАВЕЛ ШАРАМЕТ, ЖУРНАЛІСТ:**

### “ПЕРАМОГА АДНАЗНАЧНА БУДЗЕ ЗА РАСІЯЙ”.

— Адназначна выйграе Расія. Ніякіх шансаў у Лукашэнкі няма, бо за шаснаццаць гадоў свайго праўлення ён напрацаваў не на адзін трыбунал. І пры ўсіх ягоных акцёрскіх талентах усё роўна ў гэтым канфлікце выйграе Расія, таму што на яе баку факты, моцны інфармацыйны рэсурс і псіхалагічная стомленасць насельніцтва ад прэзідэнта Лукашэнкі.

**НАТАЛЛЯ КУПРЭЙЧЫК, МЕНЕДЖАР:**

### “ТУТ НЕ БУДЗЕ ПЕРАМОЖЦАЎ”.

— Тут не будзе пераможцаў. Бо што з'яўляецца перамогай? Для Масквы перамога — гэта атрыманне прадказальнага, паслухмянага рэжыму ў Беларусі, новага прэзідэнта на правах губернатара, а ў нашых умовах гэта наўрад ці магчыма. Што з'яўляецца перамогай для Беларусі? Пабудова нармальнай еўрапейскай краіны. А дасягненне гэтай перамогі не мае ніякага дачынення да тэлевізійных сварак. Перамогай жа для асобы, супраць якой вядзецца гэтая вайна, з'яўляецца перамога на выбарах і ўтрыманне ўлады. Пакуль няма ніякіх падстаў сумнявацца, што ўлада будзе ўтрымана. І нейк дзіўна назіраць, што разумная грамадскасць сур'ёзна ставіцца да гэтай вайны, а палітыкі нейк узгадняюць з маскоўскімі жоўтымі фільмікамі свае планы. Ізноў кола гісторыі павярнулася такім бокам, што беларусы глядзяць на сваю будучыню праз Маскву. Гэта дзіўна, сумна і вартае жалю. Гэтая вайна — не беларуская справа, таму ў ёй пераможа Лукашэнка.

*Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1*

# ДАДЗЕНЫ ЗАГАД: ЯМУ — НА ГАМБІЮ…

### З РАСІЯЙ НЕ ЎСЁ ТАК СУМНА

Вось што кажа на гэты конт вядомы эканаміст **Сяргей Чалы**: "Сапраўды, і па маіх даных на сённяшні момант пацверджаныя запасы "чорнага золата" Гамбіі роўныя нулю. Краіна сама імпартуе нафту з Сенегала. Гамбія можа пахваліцца хіба толькі арахісавымі палямі. Наколькі я разумею, зараз гамбійцы ездзяць па свеце і шукаюць інвестараў для фінансавання пошукаў карысных выкапняў. Што тычыцца нашых пазіцый па энерганосьбітах, якія нам будзе пастаўляць Расія на наступны год, то тут не ўсе так сумна, як камусьці можа падацца. Незалежна ад таго, чым скончацца перамовы з Расіяй па нафце, свае 6,3 мільёна тон бяспошліннай нафты, згодна з дамоўленасцямі з расійскім бокам, мы павінны атрымаць у любым выпадку. З газам усё выглядае больш складана, але зусім не смяротна".

А вось з гамбійскім "прываркам" для беларускага боку ў выглядзе магчымай распрацоўкі і здабычы нафты ў афрыканскай краіне, сапраўды, пакуль складана. Паўтаруся, можа, мы чаго не ведаем. Але сёння Гамбія выглядае даволі блякла на фоне нават вельмі далёкіх ад нас, але сапраўды багатых на нафту Венесуэлы і Ірана.

### ГЭТА ПАЛІТЫЧНЫ ХОД

Ды і Венесуэла з Іранам — гэта больш палітыка, чым эканоміка, сцвярджае доктар эканамічных навук прафесар Барыс Жаліба: "Па-першае, нават калі гіпатэтычна нейкія запасы нафты ў маленькай Гамбіі ёсць, то іх трэба да канца разведаць, потым арганізаваць здабычу, а затым заняцца яе дастаўкай у Беларусь, што таксама будзе зусім нятанна і няхутка. Так што магчымае супрацоўніцтва з Гамбіяй у галіне энерганосьбітаў выглядае вельмі сумніўна ў плане эканамічнай эфектыўнасці.

Па-другое, пасля канчатковых падлікаў па кошце венесуэльскай нафты, што сюды дастаўляецца, урэшце ўсе, пэўна, зразумеюць, што на дадзены момант больш выгаднай альтэрнатывы расійскай нафце не існуе.

Па-трэцяе, шукаць альтэрнатыву трэба, але гэтыя пошукі сёння не даюць патрэбнага плёну. І Гамбія ўяўляе сабой чарговы палітычны ход беларускага кіраўніцтва".

Мамаду Тангара падчас сустрэчы са сваім беларускім калегам заявіў, што "мы чакаем падтрымкі ад Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі. У Гамбіі вельмі ўрадлівыя землі. Пакуль мы яшчэ не вырабляем сельскагаспадарчай прадукцыі, дастатковай для ўнутраных патрэб, але хацелі б у будучыні выйсці на такі ўзровень, калі будзем яе экспартаваць". І тут, маўляў, былі б вельмі дарэчы беларускія трактары і сельскагаспадарчыя тэхналогіі.

### МАРЫ, МАРЫ

Сапраўды, зямля ў Гамбіі вельмі добрая, і людзі быццам бы нядрэнныя, але вось грошай у гэтай краіны, мякка кажучы, небагата. Таму спадзявацца, што яна ўжо ў бліжэйшай будучыні стане ўкладваць "па поўнай" у развіццё сваёй сельскагаспадарчай галіны за кошт пакупкі буйных партый беларускай тэхнікі і запрашэння соцень і тысяч нашых спецыялістаў, ну ніяк не выпадае. Грошы ж, і немаленькія, беларускаму бюджэту патрэбны сёння. Калі не ўчора.

Хоць памарыць, канечне, можна.

А прэзідэнт там правіць з 1994 года…

**ВІКТАР АЛЯШКЕВІЧ**

# ПРАДУКТОВЫ СКАНДАЛ

**Дзяржаўнае прадпрыемства вырашыла асвяціць сваю прадукцыю, але тая па гэтай прычыне не трапіла ў продаж — у крамах палічылі, што «праваслаўнае» харчаванне будзе адпужваць пакупнікоў-каталікоў і мусульман.**

На пачатку жніўня іерэй Андрэй Смольскі з благаславення архіепіскапа Віцебскага і Аршанскага Дзмітрыя асвяціў абсталяванне і прадукцыю Віцебскага садавіна-агародніннага камбіната. На ім вырабляюць харчаванне для дзяцей, кормячых маці і цяжарных жанчын. Як патлумачыў начальнік сектара знешнеэканамічнай дзейнасці Сяргей Рыжоў, пасля праведзеных маркетынгавых даследаванняў на камбінат запрасілі святара.

Святар быў на камбінаце 6 жніўня. А ўжо 9 жніўня, кажа Сяргей Рыжоў, прадпрыемства планавала адгрузіць першыя партыі сваёй прадукцыі ў крамы, аднак раптам сутыкнулася з нежаданнем апошніх гандляваць асвечаным дзіцячым харчаваннем.

**Сяргей Рыжоў:** *«Ёсць прадпрыемствы, нават у нашым абласным цэнтры, якія катэгарычна адмовіліся браць прадукцыю, якую асвяціла праваслаўная царква. Афіцыйнай адмовы мы ад іх не атрымалі, але ёсць вуснае распараджэнне іх кіраўнікоў, сэнс якога ў тым, што калі яны ўбачаць на паліцах сваіх крам гэтую прадукцыю, то таваразнаўцы, якія яе прынялі, будуць звольнены».*

А перад гэтым, кажа ён, ад прадпрыемства патрабавалі пісьмовага пацвярджэння з епархіі, што такое благаславенне было атрымана. Але і потым дзіцячае харчаванне, асвечанае праваслаўным святаром, крамы браць не сталі.

Каб праверыць атрыманую інфармацыю, Еўрарадыё патэлефанавала ў харчовую краму Віцебска і запытала пра наяўнасць асвечаных дзіцячых сокаў і кансерваў.

**Прадаўшчыца крамы № 137:** *«Пакуль у нас яшчэ не было такой, асвечанай».*

Ледзь не палова харчовых крам Віцебска належыць акцыянернаму таварыству «Веста». Як патлумачыла Еўрарадыё супрацоўніца гандлёвага аддзела арганізацыі, дзіцячае харчаванне мясцовага камбіната яны пакуль не бралі, бо ў ім няма патрэбы. Неўзабаве патрэба з'явіцца, але браць асвечаныя праваслаўным святаром пюрэ і сокі яны асцерагаюцца без адпаведнага дазволу чыноўнікаў выканкама.

**Супрацоўніца ААТ «Веста»:** *«Мы ў курсе ініцыятывы камбіната, але яшчэ не прынялі ніякага рашэння на гэты конт (*браць прадукцыю на рэалізацыю — **Еўрарадыё***). Як вы лічыце, калі я каталік і прыйшла ў краму за дзіцячым харчаваннем, то павінна пайсці з яе? У краіне, і ў Віцебску ў тым ліку, жывуць прадстаўнікі розных рэлігійных канфесій. Што я павінна адказваць на такія вось словы пакупнікоў? Мне б хацелася, каб гэта пракаментавалі органы кіравання».*



*Для дзяцей – самае лепшае. Але не асвечанае адной царквой*

**EURORADIO.BY**

# ЧАМУ БІЗНЕС НЕ ІДЗЕ Ў ПРАВІНЦЫЮ

**Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі запатрабаваў разабрацца, з якой прычыны бізнес не ідзе ў правінцыю, чаму не выконваецца дзяржаўная праграма развіцця малых і сярэдніх гарадоў. На больш як 30 тысячах прадпрыемстваў заробак сёлета складае менш чым 200 долараў. У рэгіёнах не створаны ўмовы для заснавання прыватнага бізнесу.**

**ГОМЕЛЬШЧЫНА:**

## ЯКАЯ ЎВАГА, ТАКІ І БІЗНЕС

На Гомельшчыне ў малых гарадах і паселішчах сёлета планавалася адкрыць 235 розных невялікіх вытворчасцей. Але ў такіх населеных пунктах, як Рагачоў, Петрыкаў, Парычы, Лоеў, Уваравічы, наогул няма ніводнай новай вытворчасці.

Аб прычынах гаворыць індывідуальны прадпрымальнік спадар Валер з Уваравічаў:

“Няма магчымасці наняць людзей, як гэта было раней, — да трох чалавек. Таксама няма магчымасці нармальна завозіць тавар, як гэта павінен рабіць прадпрымальнік. Я нібыта маю права ўвезці тавар з іншай краіны на суму да 10 тысяч долараў, але практычна зрабіць гэта немагчыма. Мытная служба падчас праверкі кажа: так, у цябе дзве рэчы гэтыя, дзве гэтыя, астатняе — на вагі. Колькі ў цябе там кілаграмаў? Іх і памнажаем на 4 еўра”.

У малых гарадах і паселішчах развіццё малога бізнесу шмат у чым залежыць ад стаўлення да яго мясцовага кіраўніцтва, якое, у сваю чаргу, прыстасоўваецца да патрабаванняў начальства.

**МАГІЛЁЎШЧЫНА:**

## МАЛА ДЗЕ ЁСЦЬ ЗМЕНЫ, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА ПРЫВАТНАГА БІЗНЕСУ

Для чыноўнікаў на Магілёўшчыне выкананне прагнозных паказчыкаў росту колькасці суб’ектаў дробнага бізнесу больш важнае за рэальны стан спраў з прадпрымальніцтвам.

Асаблівых праблем з рэгістрацыяй бізнесу ў малых гарадах няма, сцвярджае прадпрымальнік Вячаслаў Шэлег, але і жадаючых пачаць свой бізнес няшмат. Папаўняюць шэрагі прадпрымальнікаў найчасцей беспрацоўныя, бо яны не могуць знайсці сабе іншага занятку ў невялікім горадзе.

Вось што гаворыць В.Шэлег:“Ён бы мог працаваць, як і раней, індывідуальным прадпрымальнікам, але з улікам таго, што не можа наняць работніка, вымушаны адкрываць фірму. А тут ужо чакаюць вялікія складанасці. Адсутнасць бухгалтараў, адсутнасць ведаў — і недасведчаны чалавек можа нарабіць шмат памылак. Асабліва ў малым горадзе, бо там няма кваліфікаваных спецыялістаў. Пры праверках будуць выяўлены сур’ёзныя парушэнні”.



*Бізнесменаў у правінцыі больш успрымаюць як свінак-капілак, якія ў любы момант можна разбіць.*

**ВІЦЕБШЧЫНА:**

## УЛАДА ЗРУЙНАВАЛА ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

Паводле слоў былога прадпрымальніка Васіля Ільніцкага, колішняга ўладальніка аўтакэмпінга ў вёсцы Кузьміна Гарадоцкага раёна, улады з ім ужо “разабраліся”: анулявалі пасведчанне прадпрымальніка і зруйнавалі той самы “аб’ект прыдарожнага сэрвісу”, які быў сямейным бізнесам Ільніцкіх 20 гадоў.

“Гэта было прыватнае прадпрыемства па аказанні паслуг прыдарожнага сэрвісу на міжнароднай трасе Санкт-Пецярбург — Адэса: з 1991 года — кааператыў, а потым — прадпрымальніцкая структура. Прадпрымальніцтва маё скончылася, калі мяне абвінавацілі ў незаконным захопе зямлі. Я судзіўся, два суды выйграў, яшчэ тры прайграў, і тады сказаў, што буду займацца дабрачыннасцю”.

Васіль Ільніцкі распавёў, што мусіў ператварыць кэмпінг у сацыяльны прытулак, выкарыстаўшы для гэтага ўласную маёмасць. Частку гэтай маёмасці ў прадпрымальніка адсудзілі, у тым ліку гатэль, дзе спыняліся кіроўцы-дальнабойшчыкі. Некалькі астатніх домікаў спадар Ільніцкі назваў “Прытулкам для абяздоленых і пакрыўджаных уладамі”. Гэта быў, як кажуць, некамерцыйны праект, але і ён працягваў замінаць начальству: аднойчы ён папаўся на вочы старшыні аблвыканкама Аляксандру Косінцу. Пабудовы тэрмінова пачалі зносіць, спаслаўшыся на рашэнне гарадоцкіх улад, прынятае нібыта яшчэ ў 2006 годзе.

Пабудовы схавалі далей ад вачэй абласнога начальства. Іншую маёмасць, што была на падворках, проста закапалі ў зямлю...

**БЕРАСЦЕЙШЧЫНА:**

## УМОВЫ ПРАЦЫ НЕ СПРЫЯЮЦЬ БІЗНЕСОЎЦАМ

На Берасцейшчыне зарэгістравана больш за 34 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў. Многія з іх скардзяцца на перашкоды ў працы.

Прадпрымальнік з Івацэвічаў Андрэй, які адкрыў кавярню паблізу горада, кажа, што чыноўнікі запэўніваюць, што стварыць сёння сваё прадпрыемства не ўяўляе цяжкасці. Але гэта не зусім так. Каля Івацэвічаў праходзіць дарога Варшава — Масква. Падаецца надзвычай выгадным стварыць там кавярню, але на гэта патрэбна вялікая колькасць часу:

"Вось калі я сёння вазьму каля дарогі ўчастак для кавярні, то ў самым лепшым выпадку я змагу пачаць працаваць толькі праз два гады. Цэлы год мне спатрэбіцца на тое, каб стварыць праект, потым — будоўля. Уявіце, колькі на гэта спатрэбіцца сродкаў. Тут як мінімум неабходна 100 мільёнаў рублёў".

**ГАРАДЗЕНШЧЫНА:**

## "ПРЫВАТНІКІ БАЯЦЦА ЎКЛАДВАЦЬ ГРОШЫ Ў БІЗНЕС, БО ЎЛАДА ДЗЕЙНІЧАЕ НЕПРАДКАЗАЛЬНА".

Нават улады адзначаюць, што ў невялікіх гарадах малы бізнес развіваецца горш, чым трэба.

Валянцін Бранцэвіч узначальвае абласную арганізацыю “Садружнасці” — Беларускага прафсаюза работнікаў розных форм прадпрымальніцтва. Ад чаго залежыць развіццё прыватнай ініцыятывы ў малых гарадах?

Бранцэвіч: “Для малых гарадоў сёння дзяржава мае праграму: там і падаткаабкладанне меншае, займацца бізнесам можна, але чаму не ідуць туды? А таму, як мне здаецца, што мясцовы райвыканкам удзяляе гэтаму пытанню недастатковую ўвагу”.

Улады заклікаюць прадпрымальнікаў ствараць вытворчасць, выпускаць прадукцыю, а не толькі займацца гандлем.

Бранцэвіч: “Што тычыцца дробнай вытворчасці, зборачных, то тут важна, каб знайшоўся такі чалавек, які вырашыў бы зрабіць аўтамайстэрню, выпуск нейкай прадукцыі, даў працу людзям. З гэтым ёсць складанасці. У Зэльвенскім раёне, можа, увогуле якія два прыватныя прадпрыемствы, а можа іх зусім няма. Хутчэй за ўсё, бо ў мінулым годзе не было”.

А ў справаздачах улады вельмі цэняць лічбы.

**РАДЫЁ СВАБОДА**

# ПАДАТАК З КАНЬЯКУ

**Не так даўно малодшаму сыну кіраўніка дзяржавы прэзентавалі 400-літровую бочку каньяку. Навіна шырока разышлася па сродках масавай інфармацыі. Каментары і высновы — самыя розныя.**

"Тут і цяпер" вырашыла пацікавіцца, што прэзентавалі некаторым іншым асобам, якія займалі высокія дзяржаўныя пасады.

## СТАНІСЛАВА ШУШКЕВІЧА ЗАВАЛІЛІ ГАЛЬШТУКАМІ

— Калі быў пры пасадзе, то маім блізкім падарункаў ніхто не дарыў, — *узгадвае старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Станіслававіч*. — Гэта проста не было прынята. А што да мяне самога, то, ведаеце, у мяне былі даволі прынцыповыя звычкі. Памятаю, аднойчы да мяне прыйшла прафсаюзная дзеячка з Ізраіля і прынесла нейкі падарунак. Я тады ёй сказаў фразу з аднаго кінафільма: маўляў, самы дарагі падарунак, які магу прыняць, — гэта гальштук, а даражэй за гальштук — ні-ні. І пасля гэтага мне надарылі столькі гальштукаў, што я нават не ведаў, што з імі рабіць. Але ж сам упэкаўся…

У мае часы не было закона, згодна з якім падарункі дзяржаўным дзеячам разглядаліся як падарункі дзяржаве і павінны былі аддавацца ў музей. Таму некаторыя рэчы і дагэтуль захоўваюцца ў мяне. Напрыклад, падарунак ад Клінтана. Ён ведаў, што я збіраю карты, і падарыў мне некалькі калод ігральных карт у такой добрай скрыначцы.

Яшчэ былі розныя знакі павагі — напрыклад, люлька ўкраінская, якую Краўчук падарыў. Бразаўскас у дзень нараджэння прэзентаваў мне прыгожы паляўнічы рог. Яшчэ былі падарункі, якія з'яўляюцца не грашовай каштоўнасцю, а чалавечай. І такіх было даволі шмат.

Магу распавесці такую цікавую гісторыю. Прыехаў неяк да мяне адзін важны кувейцкі дзеяч (было гэта яшчэ да пачатку вайны ў Кувейце) і падарыў мне медальчык з гравіроўкай. Я паклаў яго некуды і забыў. Думаю: ну, проста такі знак павагі. Тым больш і гліняныя медальчыкі дарылі, і іншыя. А пасля завітаў да мяне адзін знаёмы, пакруціў гэты кувейцкі медальчык і запытаўся: "Ты ведаеш, колькі ён каштуе?" Я кажу: "Не". Як высветлілася, гэты медаль выраблены з найчысцейшага золата вельмі высокай якасці. Жонка, калі даведалася, забрала яго і дагэтуль мне не паказвае. Кажа: калі будзе цяжкая хвіліна, знойдзем яму прымяненне.

Канешне, прыносілі і розныя напоі. Адзін індус праз майго памочніка перадаў мне бутэльку дарагога каньяку "Хенэсі". У Японіі дарылі нацыянальныя напоі.

А што тычыцца бочкі каньяку, якую ў Арменіі падарылі Мікалаю Лукашэнку… Я добра ведаю такія армянскія традыцыі. У мяне быў знаёмы армянін, які расказваў, што калі ў яго нарадзіўся сын, ён закапаў пяць бочачак каньяку. Першую адкрылі, калі адзначалі 16-годдзе сына; другую — калі гулялі ў яго на вяселлі, трэцюю — калі ў сына нарадзілася дзіця, чацвёртую — у даволі нечаканым выпадку. Гэта проста традыцыя такая…



*Армянскі каньяк, тым больш 400 літраў, вельмі дарагі падарунак*

## ПРЭМ'ЕРАМ "КРУПНЯКА" НЕ ПЕРАПАДАЕ

— Прэм'ер-міністрам, як правіла, "крупняка" ніколі не дораць, — *з жартам гаворыць былы прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Чыгір*. — Вазу, скрыначку — усё па дробязі.

Праўда, быў адзіны выпадак. Я тады якраз вёў перамовы з "Філіпсам" — мы хацелі аддаць гэтай кампаніі два нашы тэлевізійныя заводы, у чым "Філіпс" быў вельмі зацікаўлены. Яны ведалі кваліфікацыю нашых спецыялістаў. Была створана працоўная група. Мяне запрасілі ў цэнтральны офіс кампаніі і далі мне там вельмі буйны хабар — яны падарылі Мінску лямпы для асвятлення горада на 200 000 долараў. Тыя лямпы служаць у некалькі разоў даўжэй за нашы, і электраэнергіі ўжываюць як мінімум у два разы менш. Мне выпісалі такі прыгожы сертыфікат на гэтыя лямпы. Калі я прыехаў і паказаў яго Аляксандру Рыгоравічу, ён адразу запытаўся: "А чаму сертыфікат яны выпісалі менавіта на вас, а не на мяне?.."

А калі я быў у Крыкаўскіх склепах, мне прыпаднеслі бутэльку віна, выробленага ў год майго нараджэння. Мы яе выпілі, здаецца, на маё пяцідзесяцігоддзе…

## ГРЫБУ ТАКСАМА ПРЭЗЕНТАВАЛІ КАНЬЯК

— Я каштоўных падарункаў не атрымліваў, — *цвёрда і пераканаўча гаворыць апошні старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Мечыслаў Грыб*. — Не было такой традыцыі. Дарылі ў асноўным сувеніры, дробязі розныя. Калі ездзілі за мяжу, то ў Польшчы, напрыклад, прэзентавалі маленькія сцягі, польскую Канстытуцыю, медальчыкі розныя. Хаця ў Малдове, памятаю, віно і каньяк дарылі.

**МАРЫНА МІТ**

**ПА СУТНАСЦІ**

**ЮЛІЯ ЧЫГІР, ГАСПАДЫНЯ, ЖОНКА ЭКС-ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА БЕЛАРУСІ:**

## "ЧАМУ БАБУЛЬКІ ПЛАЦЯЦЬ ПАДАТКІ, А КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ — НЕ?"

— Мяне здзіўляе, чаму Аляксандру Рыгоравічу ніхто не нагадае, што па законе ў нас з дарагіх падарункаў трэба плаціць падаходны падатак, — засяроджвае ўвагу Юлія Станіславаўна. — Няхай альбо не так моцна афішуе падарункі, альбо падаткі плаціць. Перад дзяржавай усе павінны быць роўнымі. І такія буйныя падарункі лічацца даходамі з-за мяжы. Напрыклад, некалі Ксенія Волкава (тая дзяўчына, якая перамагла ў перадачы "Апошні герой") не магла ўвезці ў краіну падораны ёй джып. І ёй давялося прадаць машыну, бо інакш яна б заплаціла вялікія падаткі. А вось Аляксандру Рыгоравічу даволі часта прэзентуюць і веласіпеды, і іконы, і іншыя рэчы. І ён шчыра кажа: гэта не я сам купляў, гэта ўсё мне падарылі!

Я не разумею, навошта ўвогуле была зроблена рэклама гэтай бочцы каньяку? Каб лішні раз раздражніць нейкую бабульку, якой сын з-за мяжы дасылае матэрыяльную дапамогу, з якой яна павінна заплаціць падатак? А чым прэзідэнт краіны лепшы за гэтую бабульку?..

**ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО…**

У свой час прэзідэнт Савецкага Саюза Міхаіл Гарбачоў перадаў у Дзяржаўны музей сучаснай гісторыі Расіі калекцыю прэзентаваных яму ў розныя часы падарункаў — усяго 1700 прадметаў.

Рэчы, якія дарылі прэзідэнту Расіі Барысу Ельцыну, у Дзяржаўны музей сучаснай гісторыі не трапілі. Відаць, аселі недзе ў сховішчах Крамля.

# ЯК ЗНІШЧАЛАСЯ БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ

**Дзевяць год назад на беларускім радыё і ТБ адбыўся своеасаблівы пераварот. Новы кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Ягор Рыбакоў узяў курс на русіфікацыю, скарачэнне мастацкага вяшчання ды пазбаўленне ад людзей, якія прафесійна выконвалі сваю працу ды мелі ўласную пазіцыю.**




*Будзем спадзявацца, што Беларусь будзе мець менавіта беларускае радые*

Праўда, ужо ў 2005-м Рыбакова асудзілі на 11 гадоў за "адкаты", аднак сістэма была паламаная. Пра гэта і многае іншае "Тут і цяпер" распавёў журналіст Пятро Сабіна, які чвэрць стагоддзя адпрацаваў у галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё.

— Я вучыўся на аддзяленні "Радыё і тэлебачанне", а таму атрымаў накіраванне ў галоўную рэдакцыю літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. Адразу адчуў, што праца па душы. 4 гады загадваў аддзелам публіцыстыкі. Вёў гумарыстычныя праграмы "Вясёлы эфір" ды "Смяяцца не грэх", штомесяц пісаў нарысы. А галоўнае — поўная свабода творчасці. З артыстамі былі добрыя стасункі. Пра літаратараў і гаворкі няма. Неназавеш аніводнага, хто не прыносіў бы да нас сваіх тэкстаў. За чвэрць стагоддзя прайшоў шлях ад малодшага рэдактара да каментатара. Мог заняць і вышэйшую пасаду галоўнага рэдактара, але да гэтага не імкнуўся. Як чалавека творчага мяне найперш цікавіла жывая праца: камандзіроўкі па Беларусі, сустрэчы з людзьмі.

**— Наколькі моцным у савецкія часы быў ідэалагічны ціск на радыё?**

— Напрыканцы 70-х здарылася такая гісторыя. Вядомы сёння пісьменнік Васіль Якавенка тады супрацоўнічаў з нашай рэдакцыяй. Аднойчы ён прынёс нарыс пра Аснежыцкі калгас. Я рыхтаваў матэрыял да эфіру, і ніякіх пытанняў не ўзнікла. Прагучаў ён у дзвюх частках. А тамака эпізод быў наступны. Стаяць Якавенка і старшыня калгаса ды разважаюць пра стан палеткаў пасля зімы. Было вядома, што ў той час Машэраў рабіў аблёт калгасаў. Вось ляціць шрубалёт, а старшыня і кажа: "Канечне, з неба лепей відаць, але хлеб на зямлі вырошчваюць". Гэта быў відавочны папрок у бок Машэрава, але ўсе, у тым ліку цэнзары, яго прапусцілі. Затое адразу да нас прыляцела раз'юшаная Лазоўская з ідэалагічнага аддзела ЦК. Там намёк палічылі за абразу, за грубае парушэнне этыкі. Сабралі ўсю рэдкалегію, дырэкцыю праграм і ўчынілі "разгон". Усе, хто меў нейкае дачыненне да гэтай справы, атрымалі вымовы і папярэджанні.

Неаднойчы і ў галоўнае ўпраўленне цэнзуры выклікалі — падкопы там вышуквалі на роўным месцы. Потым сядзіш, даводзіш ім, але ўсё адно многае здымалі.

**— Пісьменнік і перакладчык Валянцін Тарас, узгадваючы перыяд канца 70-х, пісаў, што ў рэдакцыі "Нёмана" супрацоўнікі хоць і выпівалі, але з-пад стала. А на радыё?**

— У нас абстаноўка была больш дэмакратычная. Вядома, ніхто б не ўхваліў за гойсанне нападпітку па калідорах Дома радыё. Але з пэўнай нагоды ў кабінеце можна было спакойна сабрацца і стол зрабіць, і выпіць. Увогуле нашы радыёжурналісцкія пасведчанні магічным чынам уздзейнічалі на людзей у раёнах. Прымалі амаль як партыйных бонзаў. Усюды нас вазілі самі мясцовыя начальнікі. Частавалі ўсім самым найлепшым: сталы ўгіналіся ад колькасці страў і асартыменту напояў. Вельмі ж яны баяліся крытычных рэпартажаў.

**— Як у радыйным асяродку ўспрымалі перабудову і адраджэнне?**

— Усё было такім новым і нечаканым, асабліва стаўленне да беларускай мовы, нацыянальнай гісторыі! Людзям гэта было вельмі цяжка адразу асэнсаваць, паставіць сябе на новыя рэйкі. Маладзейшыя, канечне, з прыкметным уздымам і натхненнем ставіліся да пераўтварэнняў. Сталыя — больш хваравіта. Былі і тыя, хто выступаў супраць адраджэння. Для іх крах партыі стаўся асабістай трагедыяй. Але праца тады бачылася ўжо па-новаму. З'явіліся смелыя, рашучыя матэрыялы, у якіх усё называлася сваімі словамі. Было так прыемна. Але белую паласу, як водзіцца, змяніла чорная...

**— Што ж спрычынілася да звальнення з любімае працы, якой вы аддалі больш за чвэрць стагоддзя?**

— Палітыка новага старшыні Белтэлерадыёкампаніі Ягора Рыбакова. Колькі чалавечых лёсаў тады было паламана! У 2002 годзе літаратурна-драматычную рэдакцыю і наогул мастацкае вяшчанне знішчылі. Амаль з усімі супрацоўнікамі скасавалі кантракты. Потым, калі здарыўся скандал з Рыбаковым, новае кіраўніцтва абдумалася, але дзе ж ты ўсіх збярэш?! Ні я, ні мае калегі прынцыпова не хацелі вяртацца, якія б грошы нам не прапаноўвалі.

### ДАВЕДКА "ТІЦ"

Пятро Сабіна нарадзіўся ў 1947 годзе ў вёсцы Міхалкавічы Лагойскага раёна. З 1975 па 2002 год працаваў у галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. Друкаваўся ў часопісах "Беларусь", "Полымя", "Маладосць" ды інш. Майстар экалагічнай прозы. Аўтар першага ў краіне "Путеводителя по городам и районным центрам РБ" (2004).

## ЦІКАВОСТКІ АД САБІНЫ

— У шматлікіх паездках па Беларусі даводзілася чуць дзіўныя рэчы, — распавядае Пятро Сабіна. — Адна такая гісторыя адбылася непадалёк Астраўца. Драўляны касцёл у мястэчку згарэў, і на яго месцы адбудавалі цагляны. Памёр ксёндз. Ідзе пахавальная працэсія. Дзяк нясе ў руках вазон з пакаёвымі кветкамі. Раптам ён спатыкаецца, вазон разбіваецца, а ў ім напалову — залатыя манеты. Дзяк валіцца, прыкрываючы вазон сваёй рызай, і пачынае галасіць: "Ах, ты мой збанок!" Ніхто не разумее, што такое, а ён ляжыць і плача.

А вось другая гісторыя. Справа была падчас калектывізацыі. Бальшавікі разарылі сялібу, далі гаспадару жыллё ў калгасе. У яго старую хату за барахлом прыехаў кіроўца. У той час усюды былі ложкі з металічным каркасам. Падымае ложак — нешта надта цяжкі. Разбіўшы каркас, ён асалапеў ад здзіўлення: полыя трубкі былі наладаваныя залатымі манетамі.

**АНДРУСЬ ХВАЁВЫ**

# Р. КАСТУСЁЎ ПАДПІСАЎСЯ ЗА У. НЯКЛЯЕВА

**Кандыдат у прэзідэнты на маючых адбыцца ў Беларусі прэзідэнцкіх выбарах Рыгор Кастусёў, вылучаны ад Партыі БНФ, паставіў свой подпіс за вылучэнне дэлегатам на чарговы "ўсебеларускі народны сход" лідара кампаніі "Гавары праўду!" Уладзіміра Някляева.**

Пры гэтым зборшчыкам подпісаў давялося некалькі хвілін чакаць, пакуль спадар Кастусёў моўчкі раздумваў над іхнай просьбай. А як толькі ён прыняў рашэнне і паставіў свой подпіс (як было відавочна — не без ваганняў), наш карэспандэнт, які ў гэтыя хвіліны быў побач, пацікавіўся ягоным стаўленнем да спробы другога меркаванага кандыдата прыняць удзел у абвешчаным форуме прыхільнікаў іншага кандыдата (які, у адрозненне ад іншых, мае досвед прэзідэнцкай працы).

Рыгор Кастусёў пракаментаваў падпісанне ліста за вылучэнне У.Някляева на "ўсебеларускі сход" наступным чынам:

— Безумоўна, я, як і многія паплечнікі па дэмакратычным асяроддзі, лічу ўсе гэтыя "ўсебеларускія сходы" (здаецца, гэты ўжо будзе чацвёртым) абсалютна неканстытуцыйнымі і нелегітымнымі мерапрыемствамі. Дзеючы прэзідэнт не мае права склікаць іх, не мае права выдаткоўваць на іх немалыя дзяржаўныя сродкі. Уявіце сабе: прыезд/ад'езд некалькіх тысяч чалавек з розных куткоў краіны, іхнае харчаванне, падарункі-сувеніры, канцэрт, ахова і арэнда залы, а таксама падпарадкаванне жыцця сталіцы раскладу і рэжыму працы гэтай прапагандысцкай сходкі. Незразумела, якім чынам туды трапляюць дэлегаты, хто яны такія... Мы памятаем сумнавядомую спробу Аляксандра Казуліна напярэдадні мінулых выбараў патрапіць на такі сход. Уладзімір Някляеў дзейнічае больш легітымна і дэмакратычна, і таму я палічыў для сябе магчымым падтрымаць гэты яго настрой. Аднак сваім подпісам я толькі сведчу сваю чалавечую і грамадзянскую павагу да знанага паэта і патрыёта. Стаўленне ж да сходу застаецца ранейшым — ён нелегітымны і незаконны.

**БАРЫС ВЫРВІЧ**

**У савецкія часы дзеці лічыліся прывілеяваным класам. І адносіны да іх з боку ўлады былі адпаведныя. Можна, безумоўна, спрачацца па гэтым пытанні: маўляў, фармалізму і паказухі хапала і тады. Аднак жа з большага варта прызнаць, што павага да дзяцей захоўвалася.**

# АДЗІН УРОК ЗАКРЭСЛІЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД?

Не тое зараз. Раней з пачаткам летніх канікул пачыналася "вялікае перасяленне" дзяцей — школьнікаў адпраўлялі на адпачынак у піянерскія лагеры мясцовага, абласнога, рэспубліканскага ды саюзнага значэнняў. Імкнуліся ахапіць аздараўленчым адпачынкам як мага большую колькасць дзяцей. Справаздачамі аб гэтым пачыналіся жнівеньскія настаўніцкія нарады.

Цяпер жа на ўсіх дзяцей адпачывальнай прасторы не хапае. Таму ім падкідваецца "карысны" адпачынак, а не марнаванне часу каля рэчак і лясоў. (Карысны з пункта гледжання дарослых, канешне.) Вось ужо некалькі гадоў з дзяцей, якія нікуды не паехалі, ствараюцца рамонтныя брыгады, якія рыхтуюць школы да навучальнага года. Ну, наколькі такі рамонт адпавядае самому паняццю "рамонт", няцяжка здагадацца — больш за тры месяцы ні наклееныя шпалеры, ні нанесеная фарба не трымаюцца.

Але давайце паспрабуем паверыць, што адміністрацыйная настаўніцкая задумка мае гуманны характар: дзяцей навучаюць працы, дзяцей адрываюць ад вуліцы; дзецям, нарэшце, выпадае магчымасць самім зарабіць самастойныя грошы, што для сямейнага бюджэту зусім някепска... Аднак жа ўсё гэта, як гаворыцца, у тэорыі. А на практыцы падлеткі, з якімі на працягу навучальнага года я займаюся ў пазашкольны час аэрамадэлізмам і з якімі проста шчыра сябрую, адпрацавалі на рамонце Чэрыкаўскай школы з 5 чэрвеня па 13 ліпеня. Больш за месяц! А вось пахваліцца заробленым і сёння не могуць — невядома ні тое, колькі яны зарабілі, ні тое, калі ім выдадуць заробак. Ну, а дзеці ж не патрабуюць свайго, не чапаюць начальства, не скардзяцца ў інстанцыі. Але міжволі наслухаўся з іхных вуснаў жаргонных слоўцаў, якіх, здаецца, і не чуў дагэтуль: "пракінулі нас", "грошыкі нашы недзе круцяцца", "нехта наварвае на нашых сродках"...

Гэта на такі ўрок разлічвалі настаўнікі і чыноўнікі райаддзела адукацыі, калі ставілі свой "працоўны эксперымент"?!

**СЯМЁН ПАНІЗОЎЦАЎ**

# КАЛІ ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД – ДЫК НАЦЫЯНАЛЬНЫ!

**У апошнія гады ў Беларусі расце цікавасць да нацыянальнага вясельнага абраду. Аб гэтым заявіла дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту Святлана Лакатко 24 жніўня на прэс-канферэнцыі ў Мінску.**

Паводле яе слоў, упершыню паслугу «беларускае вяселле» музей прапанаваў у 2005 годзе.

З кожным годам колькасць жадаючых выканаць нацыянальны вясельны абрад павялічваецца. У 2009 годзе музей прыняў 50 пар, а вясной 2010 года жадаючыя правесці вяселле ў адпаведнасці з нацыянальнымі традыцыямі ўжо запісваліся на восень, гэта значыць утварылася чарга.

Большасць жадаючых правесці нацыянальны вясельны абрад — моладзь. «Што цікава: ёсць пары, калі яна — беларуска, а ён — з іншай краіны, напрыклад немец ці японец», — адзначыла спецыяліст. Паводле яе слоў, даволі часта нявесты і жаніхі пры праходжанні беларускага вясельнага абраду апрануты ў нацыянальныя касцюмы, а не ў белую сукенку маладой і чорны касцюм маладога, як пры рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе.

Як лічыць Лакатко, рост цікавасці да нацыянальнага вясельнага абраду сведчыць аб узмацненні цікавасці да беларускай нацыянальнай культуры.

Лідар этна-трыа «Тройца» Іван Кірчук таксама заявіў, што сярод моладзі адзначаецца мода на беларускія вяселлі. Паводле яго меркавання, маладым людзям перад вяселлем належыць даведацца пра традыцыі свайго роду і сям'і, пра значэнне нацыянальных вясельных абрадаў.



*Глеб Лабадзенка і Таццяна Шапуцька нядаўна ажаніліся менавіта ў нацыянальным стылі.*

**БЕЛПАН**

# ЧЫЕ СВЯТЫНІ?

**Новы навучальны год у беларускіх школах будзе адметным: з 1 верасня набывае сілу новы Закон “Аб правілах беларускай арфаграфіі”. А яшчэ ва ўсіх класах — з першага па адзінаццаты — уводзіцца новы прадмет.**




*Рэлігійная прапаганда ніколі не прыносіла вялікага плёну.*

Меркаваная яго назва — “Асновы праваслаўнай культуры. Святыні ўсходніх славян”. Праўда, канчаткова праграма яго не зацверджана, так што назва можа крыху змяніцца, але сутнасць прадмета ад гэтага змен не пацерпіць. Кіраўніцтва Мінадукацыі Беларусі апярэдзіла нават сваіх расійскіх калег. У Расіі толькі завяршаецца эксперымент у некаторых рэгіёнах, дзе выкладаецца курс “Асновы рэлігійных культур і свецкай этыкі” (адчуйце розніцу!). У некаторых гарадах, напрыклад, у Санкт-Пецярбургу, гэты прадмет прызначаны толькі для настаўнікаў. Аўтарам падручніка па асновах рэлігійных культур стаў вядомы ў Расіі святар РПЦ айцец Андрэй Кураеў. Пра аўтараў падручніка для беларускіх школ (і ці ёсць ён увогуле?) пакуль нічога не вядома. Вядома толькі, што прадмет будзе факультатыўным. Але можна не сумнявацца, што наведванне гэтых заняткаў будзе добраахвотна-абавязковым. Узнікае натуральнае пытанне: а як быць католікам, якіх у Беларусі нямала, мусульманам, атэістам? Аднак найбольшую занепакоенасць выклікае нават не тое, што выкладацца будуць асновы праваслаўнай культуры. У прынцыпе, ужо тое, што ў школе з’явіцца прадмет, праз які хоць нейкім чынам, хай сабе ў скажоным і палітызаваным выглядзе, будуць даводзіцца да дзяцей духоўныя і культурныя каштоўнасці, само па сабе няблага. Горш іншае. Маё пакаленне, якое вучылася ў савецкай школе, добра памятае, што самымі ненавіснымі былі менавіта “факультатыўныя” прадметы, ці, напрыклад, палітінфармацыя. Адзнакі ў дзённік за іх не ставіліся, але за пропускі настаўнікі каралі. На той самай палітінфармацыі панавалі сум і абыякавасць.

Увогуле, уражанне такое, што начальства (ужо каторае яго пакаленне) ніяк не можа засвоіць простую ісціну — усё, што навязваецца зверху, сыходзіць, як вада ў пясок. Калі ў чалавека няма патрэбы верыць, ніякімі добраахвотна-абавязковымі ўрокамі яму гэта не навяжаш. Колькі ні дзяўблі ў Савецкім Саюзе пра асновы марксізму-ленінізму, а прыйшло 23 жніўня 1991 года, і ад КПСС нічога не засталося. Цяпер вось РПЦ гатова паўтарыць чужыя памылкі.

Зразумела, гэта праблема не толькі беларускага грамадства. Нават калі царква аддзелена ад дзяржавы, не ўсё так проста. У Італіі, напрыклад, працягваецца скандал з-за таго, што бацькі аднаго з вучняў выступілі супраць прысутнасці ўкрыжавання ў школьных класах. Еўрапейскі суд у Страсбургу прызнаў, што гэта пярэчыць “рэлігійным свабодам” вучняў. Аднак урад Італіі падаў апеляцыю. Большасць італьянцаў лічаць, што крыж адпавядае іх глыбокім хрысціянскім традыцыям. Але быў у гісторыі Італіі і перыяд, калі Ватыкан адчуваў на сабе ўсеагульны астракізм — італьянцы не захацелі, каб краінай кіраваў Папскі Пасад. З іншага боку, загад абавязкова вывешваць крыжы ў школьных класах выйшаў у 20-я гады мінулага стагоддзя, пры... Мусаліні.

Зараз увага ўсяго свету прыцягнута да канфлікту вакол планаў мусульманскай грамады Нью-Ёрка пабудаваць мусульманскі культурны цэнтр паблізу “гранд зэра” — месца, дзе стаялі вежы-блізняты, зруйнаваныя самазабойчай атакай самалётаў, захопленых ісламскімі фанатыкамі 11 верасня 2001 года. Тады загінулі амаль тры тысячы чалавек. Прэзідэнт Абама і мэр Нью-Ёрка Блумберг спасылаюцца на першую папраўку да Канстытуцыі ЗША, якая забараняе Кангрэсу ўмешвацца ў рэлігійныя справы. Але апаненты выступаюць не супраць свабоды выспавядання ісламу і не супраць будаўніцтва мячэцей. Яны паказваюць на той факт, што блізкасць ісламскага культурнага цэнтра да месца трагедыі, якой адкрыта радаваўся, дарэчы, увесь мусульманскі свет, выглядае, прынамсі, двухсэнсоўна. Сярод загінулых былі мусульмане, гэта так. Але чаму толькі і менавіта мусульмане будуць цяпер мець свае святыні паблізу мемарыяла? А што ж хрысціяне, іўдзеі, будысты, атэісты? Як бачым, Амерыка ад нас далёка, а пытанні ўсё тыя ж. І загадам зверху іх ніколі не вырашыць.

**МАКСІМ ПЕШКА**

**8 10 370 672 829 35**

на гэты нумар вы можаце адправіць СМС з просьбай **аформіць падпіску “Тут і цяпер”** на свой адрас

**падпіска на газету “Тут і цяпер” - БЯСПЛАТНАЯ**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 22:45 26.08.10
Тыраж 299 экзэмпляраў